# Памяти ученого

# Памяці вучонага

# To the memory of scientist



**Петр Иванович
БРИГАДИН**

**Пётр Іванавіч
БРЫГАДЗІН**

**Pjotr Ivanavich
BRYGADZIN**

Вядомы беларускі гісторык, дзяржаўны дзеяч, дырэктар Інстытута бізнесу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар Пётр Іванавіч Брыгадзін пайшоў з жыцця 12 снежня 2021 г.

П. І. Брыгадзін нарадзіўся 24 жніўня 1949 г. у в. Моладава Іванаўскага раёна тагачаснай Пінскай вобласці БССР. У сям'і было чацвёра дзяцей, якія ўжо з маленства прывучаліся да працы. Кожны меў свае абавязкі і дапамагаў бацькам. Здаралася, што не заставалася часу для падрыхтоўкі да школьных заняткаў. Але прыроджаны талент, працавітасць і імкненне да ведаў садзейнічалі таму, што ўсе дзеці атрымалі адукацыю ў БДУ.

Малая радзіма сям'і Брыгадзіных была насычана гістарычнымі сведчаннямі, падштурхоўвала да пошуку інфармацыі пра сваю спадчыну. Пасля заканчэння Моладаўскай сярэдняй школы ў 1966 г. П. І. Брыгадзін паступіў на гістарычны факультэт БДУ, які скончыў у 1971 г. Два гады служыў у Савецкай арміі ў Брэсце, быў камандзірам узвода, сакратаром камітэта камсамола палка.

Пасля вайсковай службы Пётр Іванавіч вярнуўся ва ўніверсітэт ужо з багатым жыццёвым вопытам. Сваю працоўную дзейнасць ён пачаў загадчыкам кабінета кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў БДУ. З 1977 г. П. І. Брыгадзін выкладаў на кафедры гісторыі КПСС БДУ і адначасова ўзначальваў камітэт камсамола ўніверсітэта. Любоў да працы і ўменне размяркоўваць свой час дазвалялі паспяхова сумяшчаць насычаную арганізацыйна-педагагічную дзейнасць з вучобай у аспірантуры. У 1978 г. пад навуковым кіраўніцтвам прафесара М. Я. Шкляра малады вучоны абараніў кандыдацкую дысертацыю «Камсамол Беларусі – актыўны памочнік партыі ў культурным будаўніцтве (1966–1970 гг.)». Менавіта ў гэты час закладаліся асновы навуковага светапогляду Пятра Іванавіча. Вялікі ўплыў на яго аказала дзейнасць Г. М. Ліўшыца, Ф. М. Нячая, М. П. Палетыкі, П. З. Савачкіна,



CC BY NC

У. М. Сікорскага. Творчая атмасфера і багаты навукова-педагагічны патэнцыял БДУ спрыялі таму, што, папрацаваўшы пэўны час на пасадзе загадчыка аддзела прапаганды і культурна-масавай работы ЦК ЛКСМБ, у 1982 г. Петр Іванавіч вярнуўся ў БДУ на пасаду намесніка сакратара парткама з правамі райкама КПБ.

Змены, якія адбываліся ў СССР у сярэдзіне 1980-х гг., патрабавалі ініцыятыўных і дынамічных кіраўнікоў. П. І. Брыгадзін заняў пасаду інструктара аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ. У 1988 г., у бурлівы і складаны для краіны перыяд, Пётр Іванавіч становіцца прарэктарам па вучэбнай рабоце БДУ. У гэты перыяд назіраецца імклівы росквіт беларускай гістарычнай навукі, у першую чаргу даследаванняў па айчыннай гісторыі. У 1994 г. кафедра гісторыі Беларусі гістарычнага факультэта БДУ была рэарганізавана. У выніку з'явіліся кафедра гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў (загадчыкам стаў П. А. Лойка) і кафедра гісторыі Беларусі новага і навейшага часу, якую ўзначаліў П. І. Брыгадзін.

Пётр Іванавіч не супыняў і асабістага навукова-педагагічнага росту. Станаўленне незалежнай Беларусі, праблемы фарміравання партыйных і грамадскіх структур патрабавалі ўважлівага вывучэння гістарычнай спадчыны. У 1995 г. ён абараніў доктарскую дысертацыю «Эсэры ў Беларусі (канец XIX ст. – люты 1917 г.)», а ў 1996 г. яму было прысвоена вучонае званне прафесара.

На мяжы XX–XXI стст. склаліся магчымасці для максімальнага раскрыцця арганізацыйнага і творчага патэнцыялу П. І. Брыгадзіна: у 1996–2000 гг. ён займаў пасаду першага прарэктара БДУ, рэктара Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, з 21 ліпеня 2000 г. – рэктара Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Затым, 19 кастрычніка 2001 г., Пётр Іванавіч быў прызначаны міністрам адукацыі. Перыяд яго знаходжання на гэтай пасадзе адзначыўся рэформамі. Дастаткова ўзгадаць, што менавіта пры яго непасрэдным удзеле была распрацавана і пачала рэалізоўвацца рэформа па пераходзе на 10-бальную шкалу ацэнкі ведаў у сярэдняй школе, вышэйшых навучальных і іншых адукацыйных установах Беларусі.

З 2003 г. Пётр Іванавіч займаў пасадзу дырэктара Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ (ДзІКСТ БДУ). Менавіта дзякуючы намаганням П. І. Брыгадзіна ўстанова стала карыстацца высокім аўтарытэтам. Ён з энтузіязмам займаўся ўсімі кірункамі дзейнасці: гаспадарчымі справамі, будаўніцтвам і рамонтам карпусоў, падборам прафесарска-выкладчыцкага складу, які па некаторых спецыяльнасцях толькі пачынаў фарміравацца, часта сустракаўся з прадстаўнікамі бізнесу, студэнтамі і абітурыентамі. Інстытут атрымаў правы юрыдычнай асобы, у яго структуры былі створаны новыя цэнтры і ўпраўленні. У 2004 г. тут працавалі ўжо 9 кафедр, навучаліся 1500 студэнтаў, у 2006 г. іх колькасць узрасла да 2500 чалавек. У 2016–2017 гг. Пётр Іванавіч займаў таксама пасаду загадчыка кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта БДУ. У 2018 г. ДзІКСТ БДУ быў аб'яднаны з Інстытутам бізнесу і менеджменту тэналогій БДУ, у выніку чаго быў створаны Інстытут бізнесу БДУ, які адразу стаў адной з вядучых навучальных устаноў эканамічнага профілю ў краіне. Кіраваць установай было даручана П. І. Брыгадзіну, з чым ён пасляхова спраўляўся. Аб гэтым сведчаць цудоўная матэрыяльна-тэхнічная база інстытута і поспехі яго выпускнікоў.

На працягу апошніх двух дзесяцігоддзяў Пётр Іванавіч у розны час з'яўляўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.

Разам з працай па кіраванні ДзІКСТ БДУ, а пасля Інстытутам бізнесу БДУ П. І. Брыгадзін не пакідаў і даследчыцкай дзейнасці. Ужо ў 2003 г. у суаўтарстве з прафесарам У. Ф. Ладысевым выйшла яго вядомая праца «Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.)». Навуковыя інтарэсы Пятра Іванавіча знаходзіліся ў сферы гісторыі Беларусі XIX–XX стст., палітычнай гісторыі нашай краіны, праблем дзяржаўнага кіравання, аднак ён з цікавасцю прымаў удзел у дыскусіях на іншыя тэмы развіцця айчыннай гістарычнай навукі. Пры яго дзейсным удзеле пачаўся выхад у свет новага пакалення падручнікаў па гісторыі Беларусі для студэнтаў універсітэтаў. Значны вопыт даследчай і кіраўнічай дзейнасці П. І. Брыгадзіна паўплываў на тое, што амаль два дзесяцігоддзі ён узначальваў савет па абароне доктарскіх дысертацый пры БДУ.

П. І. Брыгадзін стаў аўтарам каля 100 навуковых прац па гісторыі Беларусі, тэорыі кіравання, сацыялогіі, у тым ліку аўтарам і суаўтарам 10 манаграфій, 12 падручнікаў і навучальных дапаможнікаў, падрыхтаваў 6 дактароў і 7 кандыдатаў навук. Па шляху бацькі пайшлі і два сыны Пятра Іванавіча. Сын Дзяніс абараніў дысертацыю «Злачыннасць у Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.», з'яўляецца аўтарам шматлікіх прац па гісторыі Беларусі і юрыспрудэнцыі.

Дзейнасць П. І. Брыгадзіна адзначана суайчыннікамі і кіраўніцтвам краіны. Ён узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць» (1981), Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (1998), Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі

Беларусь (2001), удастоены званняў «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» (1998) і «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» (1999).

Пётр Іванавіч Брыгадзін ва ўсіх адносінах з'яўляўся шматграннай асобай. Ён быў не толькі выдатным навукоўцам, але і шчырым чалавекам, цудоўным бацькам і дзедам, надзейным сябрам, спагадлівым кіраўніком, паважаным выкладчыкам, надзейным дарадцам. Яго вылучалі мэтанакіраванасць, добразычлівасць, якія гарманічна спалучаліся з патрабавальнасцю і прынцыповасцю.

Навуковая супольнасць БДУ, рэдакцыйная калегія выдання «Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя», калегі, сябры і студэнты глыбока смуткуюць з нагоды смерці Пятра Іванавіча. Жалобнае развітанне з ім адбылося ў холе будынка рэктарата БДУ 14 снежня 2021 г. Пахаваны Пётр Іванавіч Брыгадзін на Заходніх могілках Мінска.

***І. І. Янушэвіч[1], А. Г. Каханоўскі[2], В. С. Макарэвіч[3], С. Н. Ходзін[4]***

[1]*Иван Иванович Янушевич* – кандидат исторических наук, доцент; проректор по воспитательной работе и социальным вопросам Белорусского государственного университета.

*Іван Іванавіч Янушэвіч* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; прарэктар па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Ivan I. Yanushevich*, PhD (history), docent; vice-rector for social and educational work, Belarusian State University.

E-mail: *yanush@bsu.by*

[2]*Александр Геннадьевич Кохановский* – доктор исторических наук, профессор; декан исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Аляксандр Генадзьевіч Каханоўскі* – доктар гістарычных навук, прафесар; дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Aliaksandr G. Kakhanouski*, doctor of science (history), full professor; dean of the faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *kohanovsky@bsu.by*

[3]*Виталий Сергеевич Макаревич* – кандидат исторических наук, доцент; заведующий кафедрой истории Беларуси нового и новейшего времени исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Віталь Сяргеевіч Макарэвіч* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Vitaly S. Makarevich*, PhD (history), docent; head of the department of modern and contemporary history of Belarus, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *makarevs@bsu.by*

[4]*Сергей Николаевич Ходин* – доктор исторических наук, профессор; заведующий кафедрой источниковедения исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Сяргей Мікалаевіч Ходзін* – доктар гістарычных навук, прафесар; загадчык кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Siarhei M. Khodzin*, doctor of science (history), full professor; head of the department of source study, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *skhodzin@mail.ru*